гражданско-патриотическому воспитанию, социализации личности, имеют негативные мотивы к данному виду деятельности.

Результаты проведенной работы свидетельствуют о том, что есть все предпосылки для активизации теоретической работы и практической подготовки студентов к гражданско-патриотическому воспитанию учащихся.

---

1. *Конституция* Республики Беларусь 1994 г. (с изменениями и дополнениями). – Мн., 1997.

2. *Сильная* и процветающая Беларусь должна иметь прочный идеологический фундамент: доклад Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко на семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов по вопросам совершенствования идеологической работы // Советская Беларусь. – 2003. – 28 марта.

**В.М.Бігеза**, *дацэнт*

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА ЯК СРОДАК ІДЭАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ

Працэс ідэалагічнага выхавання асобы бесперапынны. Значную ролю ў працэсе ідэалагічнага выхавання адыгрываюць вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія здзяйсняюць не толькі падрыхтоўку кампетэнтных, канкурэнтаздольных спецыялістаў, але і садзейнічаюць працэсу асобаснага станаўлення студэнтаў, фарміраванню ў іх гуманізму, грамадзянскай пазіцыі, высокай свядомасці, патрыятызму, уменняў суадносіць свае ўчынкі і перакананні з агульным сацыяльным кантэкстам. Гэтаму спрыяе і тое, што студэнцкі ўзрост – перыяд найбольш актыўнага развіцця маральных, эстэтычных пачуццяў, станаўлення і стабілізацыі характару. Студэнты па сваім сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэмаграфічным і псіхалагічным статусе знаходзяцца на завяршальнай стадыі фарміравання псіхічнай і сацыяльнай сталасці [1]. Менавіта ў вышэйшай навучальнай установе асоба мае магчымасць у большай ступені авалодаць сістэмай ідэй аб мэтах развіцця грамадства і чалавека, агульнанацыянальных каштоўнасцей, якія адлюстроўваюць гістарычны лёс народа.

Безумоўна, будучае краіны, неад'емнай часткай якога з'яўляецца нацыянальная ідэалогія, у значнай ступені залежыць ад таго, з якімі ідэямі, перакананнямі, ведамі і ўменнямі сённяшнія студэнты ВНУ увойдуць у самастойнае жыццё. Выкладчыкі ВНУ павінны шмат зрабіць дзеля фарміравання духоўнай, эстэтычнай і мастацкай культуры студэнтаў, своеасаблівага падмурку ідэалагічнага выхавання.

Маладыя бібліятэкары, якія будуць працаваць з дзецьмі, павінны ўсвядоміць, што першыя складнікі нацыянальнай ідэі фарміруюць фальклорныя творы, творы знакамітых пісьменнікаў і паэтаў, якія тонка адчуваюць духоўныя пошукі і спадзяванні свайго народа, а таксама далучаюць дзяцей Беларусі да скарбаў роднай мовы. “У самую раннюю эпоху свайго быцця народ ужо мае ўсе найгалоўнейшыя маральныя асновы сваёй нацыянальнасці ў мове і міфалогіі, якія знаходзяцца ў найцяснейшай сувязі з паэзіяй, норавам, звычаямі” [3]. Пацвярджэннем сказанаму ў пэўнай ступені, на нашу думку, з'яўляюцца змест і структура курса “Беларуская дзіцячая літаратура”. Курс развівае ў студэнтаў здольнасці актыўнага ўспрымання твораў, эстэтычнага адчування іх у адзінстве ідэйнага зместу і мастацкага ўвасаблення; здольнасці суперажываць, разважаць, ацэньваць, прыходзіць самастойна да пэўных высноў. Пачынаючы з вывучэння розных жанраў дзіцячага фальклору, які з'яўляецца важнейшым багаццем духоўнай культуры, студэнты далучаюцца да моўных вытокаў беларускага народа. Авалоданню роднай мовай садзейнічае вывучэнне твораў малых жанраў (прымаўкі, прыказкі, загадкі, скорагаворкі, забаўлянкі, пацешкі і інш.). Прыгожай, багатай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сакавітай беларускай мовай прасякнуты казкі. Лепшыя творы мастакоў слова дапамагаюць студэнтам глыбока пазнаць жыццё ва ўсіх яго ўзаемасувязях, раскрыць як унутраны свет чалавека, так і складаныя сацыяльныя адносіны. Менавіта на падставе вывучэння лепшых твораў беларускіх аўтараў бібліятэкары змогуць прывіць дзецям любоў да беларускай мовы, беларускага слова, бо сапраўды мова з'яўляецца асновай і камунікатыўным інструментам нацыянальнай культурнай спадчыны. Без яе захавання, выкарыстання і развіцця наўрад ці можна весці гаворку аб захаванні нацыянальнай культурнай спадчыны. І гэта можна зрабіць, напрыклад, пры чытанні твораў для дзяцей Я.Купалы, Я.Коласа, М.Танка, Н.Гілевіча, Р.Барадуліна, А.Куляшова, В.Віткі, У.Скарынкіна, У.Ягоўдзіка, К.Чорнага, В.Быкава, У.Караткевіча і іншых аўтараў прыгожага пісьменства.

Вывучаючы беларускую паэзію для дзяцей, студэнты адчуваюць, што беларускае слова здольна дзівосна закрасаваць, і стаць дзейсным стымулам выхавання ў чалавеку "ўсяго прыгожага, адмысловага і добрага" (Я.Колас). У сучаснай беларускай паэзіі ўзнаўляюцца старонкі мінулага, хвалюючы, пранікнёна створаны вобраз Беларусі. Паэты многа робяць дзеля таго, каб абудзіць у дзяцей патрыятычныя пачуцці, нацыянальную годнасць, а таксама садзейнічаць таму, каб здзяйсняўся працэс "пазнання малымі тых вялікіх маральных каштоўнасцей, што складаюць азбуку душы чалавека"[4].

Ідэалагічнае выхаванне студэнтаў грунтуецца таксама на нацыянальна-гістарычных традыцыях беларускага народа, яго подзвігах, гераізме ў барацьбе за незалежнасць Радзімы. У агульным выхаваўчым кантэксце літаратуры, як дарослай, так і дзіцячай, асобая роля належыць творам, прысвечаным тэме Вялікай Айчыннай вайны. Адлюстраванне падзей Вялікай Айчыннай вайны – гэта не толькі памяць аб мінулым. У творах аб вайне, у якіх узнімаюцца сацыяльныя, маральныя праблемы, маюць вялікае значэнне ў выхаванні сённяшняга падрастаю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чага пакалення: яго адносін да жыцця, духоўных каштоўнасцей, усведамлення свайго высокага грамадзянскага абавязку, дабрыні, спачування. Пры вывучэнні тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў літаратуры студэнты працуюць на лекцыі, рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў, праводзяць у дзіцячых бібліятэках самастойнае даследаванне па вывучэнні зацікаўленасці гэтай тэмай. Студэнты ўпэўніваюцца, што кожны ўзрост мае свой псіхалагічны матыў захопленасці творамі аб вайне: ад вастрыні сюжэта, рамантыкі барацьбы – у падлеткаў, да пошукаў жыццёвага ідэалу, сэнсу жыцця – у юнацтва. З улікам гэтага будуюцца семінарскія заняткі, якія дазваляюць не толькі шматгранна абмеркаваць значнасць гэтай тэмы ў літаратуры, але і прасачыць яе выхаваўчае ўздзеянне на юнага сучасніка, адчуць тую атмасферу памяці, якой жыве і жыло наша грамадства ўвесь пасляваенны час. Акрамя таго, кожны студэнт атрымлівае магчымасць праявіць свае індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці, праверыць свае здольнасці і развіць прафесіянальныя ўменні ў рабоце з чытачамі рознага ўзросту.

У беларускай дзіцячай літаратуры створана шмат кніг аб Вялікай Айчыннай вайне, асабліва ў прозе, пачынаючы ад унікальнай "Ніколі не забудзем" і іншых, створаных у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, да твораў, што з'явіліся пазней: "Мы з Санькам у тыле ворага", "Мы – хлопцы жывучыя", "Мы з Санькам – артылерысты" І.Сяркова, "Высакосны год", "Аповесць аб беспрытульным каханні", "Суд у Слабадзе" В.Казько, "Апошнія сведкі" С.Алексіевіч, "Тры старонкі з легенды" Г.Бураўкіна, "Маланка ўначы", "Малюнак на снезе", "Бывай, Грушаўка" Г.Васілеўскай, "Жаўранкі над Хатынню" А.Кобец-Філімонавай, "Крутыя вёрсты" У.Ліпскага, "Я вярнуся, мама!" Д.Слаўковіча (пералік, зразумела, далёка не вычарпальны). Увайшлі ў кола дзіцячага чытання пра вайну і апавяданні В.Быкава, І.Навуменкі, І.Чыгрынава, Б.Сачанкі і інш.

Пры вывучэнні тэмы Вялікай Айчыннай вайны ўвага студэнтаў скіроўваецца на неабходнасць рэкамендацыі такіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твораў пра вайну, якія вызначаюцца высокім напружаннем гуманістычнага пачуцця. І вельмі важна, “каб дзеці адчулі ў іх ненармальнасць і ненатуральнасць таго становішча, калі яны павінны былі ўзяць у рукі зброю і забіваць, хоць гэта і была святая неабходнасць” [5].

Сучасная дзіцячая літаратура пра вайну імкнецца ўсё глыбей адлюстраваць высокі гуманістычны, агульначалавечы сэнс змагання з фашызмам, узнаўляе трагізм гэтай барацьбы, якая каштавала мільёнаў жыццяў. Па-ранейшаму востра, драматычнай для грамадства і для літаратуры з’яўляецца і праблема дзіцячага гераізму, які быў незвычайным выяўленнем высокай патрыятычнай самасвядомасці юнага пакалення. Бібліятэкары нашай краіны адлюстравалі гераічны подзвіг беларускіх дзяцей, стварыўшы рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік “Юныя героі Беларусі”. На нашу думку, сёння своеасаблівым помнікам тым падзеям і іх удзельнікам, а таксама напамінам нашчадкам можа быць стварэнне спецыяльнага сайта НББ у Internet, прысвечанага мужнай барацьбе беларускага народа з фашызмам. Асобную старонку тут неабходна прысвяціць дзецям-героям, дзецям-пакутнікам. Увесь свет павінен ведаць пра гэта і памятаць.

Абагульняючы сказанае, падкрэслім, што веды ў галіне нацыянальнай дзіцячай літаратуры – гэта неад’емная частка агульнай адукаванасці, інтэлектуальнага патэнцыялу будучага бібліятэчнага спецыяліста. Вывучэнне курса садзейнічае таксама духоўнаму развіццю, фарміраванню важнейшых асобасных якасцей будучага спецыяліста: патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця грамадзянскай адказнасці перад Айчынай.

---

1. *Ананьев Б.Г.* Психофизиология студенческого возраста и усвоение знаний // Вестник высшей школы. – 1972. – №7. – С.17–26.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. *Барташэвіч Г.А.* Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору. – Мн.: Навука і тэхніка, 1976. – 168 с.

3. *Буслаев Ф.И.* О литературе. Исследования. Статьи / [сост., вступ. ст. и примеч. Э.Л.Афанасьева]. – М.: Худож. лит., 1990. – 511 с.

4. *Вітка В.* Азбука душы. – Мн.: Маст. літ., 1988. – 364 с.

5. *Гуревич Э.* Боль и тревоги наши: дети, война, литература. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – 253 с.

6. *Яскевич Я.С.* Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003. – 359 с.

**Т.П.Бирюкова,** *доцент*

## РОЛЬ ТРАДИЦИЙ В СТАНОВЛЕНИИ СТУДЕНЧЕСКОГО КОЛЛЕКТИВА

Воспитание у студентов активной жизненной позиции тесным образом связано с систематической и продуманной целенаправленной работой во внеучебное время. Жизненная позиция человека определяется его мировоззрением, т.е. убеждениями, ценностными ориентациями, мотивацией.

В формировании мировоззрения важную роль играют студенческие традиции, которые передаются от поколения к поколению, от курса к курсу и являются одним из важных средств воздействия на молодого человека.

Новые студенческие традиции и обряды формируются и развиваются как результат творческой самодеятельности, активности и инициативы самих студентов под руководством куратора группы. Естественно, жизненность традиций зависит от того, как они отражают интересы группы. Важно, чтобы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ